*У.П.СКАРАХОДАЎ*

# МАДЭРНІЗАЦЫЯ ГРАМАДСТВА І ІНАВАЦЫІ Ў КУЛЬТУРЫ

Мадэрнізацыя азначае перш за ўсё магчымасць прымянення сучасных тэхналогій у важнейшых сферах матэрыяльнай вытворчасці, пашырэння сучасных формаў спажывання і разам з тым стварэння сацыяльных, палітычных і культурных умоў для развіцця новых вытворчасцей. Мадэрнізацыя звязана таксама і з асваеннем новых тыпаў духоўнасці ў сферах, што тычацца новых формаў вытворчай дзейнасці.

Раннімі аналагамі канцэпцыі мадэрнізацыі сталі ідэі, якія шырока асвятляліся ў розных філасофскіх работах Маркса, Мейна, Кулі, Дзюркгейма [1]. Гэтыя аўтары ўказвалі на тое, што змястоўны аспект трансфармацыі сацыякультурнай сферы цягне за сабой і трансфармацыю менталітэту, якая мае на ўвазе як змяненне стылю мыслення, так і падрыхтаванасць індывідуальнай свядомасці да тэхнічных пераўтварэнняў, пераацэнкі каштоўнасцей адпаведнай эпохі.

Да ліку важнейшых фактараў мадэрнізацыі ў культурнай сферы адносяцца дыферэнцыяцыя духоўных сістэм і каштоўнасных арыентацый; секулярызацыя і плюралізацыя грамадскай свядомасці і адукацыі; фарміраванне нацыянальных культур і разнастайнасці ідэалагічных плыняў; развіццё мас-медыя [2].

У духоўным жыцці грамадства атрымліваюць развіццё розныя арыентацыі на змены і новаўвядзенні, адмаўленне ад прыхільнасці да косных традыцый. Аднак змены не ахопліваюць усёй сукупнасці сацыякультурнага працэсу і прызнаюцца толькі ў функцыянальна неабходных сферах, звязаных з новымі спадзяваннямі. Важнымі параметрамі гэтых змен з'яўляюцца ступень мабільнасці насельніцтва, мера яго ўдзелу ў сацыяльным і палітычным кіраванні, далучанасць розных сацыяльных груп да сучаснай культуры.

Мадэрнізацыя ахоплівае ўсё больш шырокія слаі насельніцтва, вызваляючы іх з ранейшых застойных формаў быту і вытворчасці. Пры мадэрнізацыі працэсаў адбываюцца ўмацаванне прадпрымальніцкіх слаёў і павелічэнне аб'ёму наёмнай працы. Найбольш мабільнай сферай становіцца сфера духоўнай вытворчасці, перш за ўсё ў межах сістэмы адукацыі, якая і фарміруе адзін з найбольш мабільных слаёў грамадства – інтэлігенцыю [3].

Інфраструктура мадэрнізацыі азначае рост дыферэнцыяцыі інстытутаў, якія бяруць на сябе функцыю рэгуляцыі новых формаў дзейнасці. Усе сферы жыцця набываюць бóльшую разнастайнасць, што парушае і разбурае ранейшыя абмежаванні. Для культуры асабліва значэнне набываюць этнічная, рэлігійная, ідэйна-палітычная і сацыякультурная сітуацыі ў краіне; узровень, шырыня і даступнасць сістэмы адукацыі; ступень развітасці сродкаў масавай інфармацыі; прававая рэгуляцыя адносін.

Пры павярхоўным разглядзе сацыяльных працэсаў можа ўзнікнуць уражанне, што асновай мадэрнізацыі з'яўляюцца ўдасканаленне тэхнікі і тэхналогіі вытворчасці, змены ў эканамічных адносінах, якія выклікаюць і змены ў паводзінах насельніцтва, а значыць, і змены ў сацыяльных адносінах, палітыцы, праве, ідэалогіі і культуры. Працэс мадэрнізацыі павінен быць забяспечаны адпаведнымі сацыяльнымі і культурнымі падставамі. У сацыяльным сэнсе рухальнай сілай мадэрнізацыі выступаюць у пераважнай большасці актыўныя слаі, якія займаюць нібы пабочную, прамежкавую пазіцыю ў адносінах да ранейшых кіруючых класаў. Такімі былі буржуа ў адносінах да сялян, рамеснікаў і феадалаў у эпоху ранняга прамысловага перавароту. Такую ж ролю адыгрывалі гарадскія сярэднія слаі і тэхнакраты ў адносінах да пралетарыяту і буржуазіі ў перыяд разгортвання развітога індустрыяльнага грамадства з масавай вытворчасцю. На новым этапе мадэрнізацыі актыўную ролю адыгрываюць рабочы клас (у складзе найбольш кваліфікаванай яго часткі), масавыя рухі і інш. Тым не менш, паспяховая мадэрнізацыя заўсёды вызначалася "цэнтрызмам" злучэннем мадэрнізатарскіх слаёў, што арганічна вырастаюць з нетраў грамадства, з уплывовымі часткамі іншых класаў пры "адсячэнні" крайніх цячэнняў і дасягненні становчага кансэнсусу [4]. Такім чынам, як ужо адзначалася раней, мадэрнізацыя – працэс супярэчлівы. Яна ўключае барацьбу старога і новага, разбурэнне і стварэнне, сутыкненне інтарэсаў розных сацыяльных і палітычных сіл, якія змагаюцца за атрыманне найбольшых выгад у новым сацыяльным уладкаванні ці проста за выжыванне. Адбываецца змяненне ранейшых адносін, і адначасова ўсё большае значэнне набываюць іх новыя формы, заснаваныя на функцыянальных крытэрыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучаснае грамадства Беларусі жыве ў сітуацыі паступовага ўсведамлення разнастайнасці каштоўнасцей. Пагадзіўшыся з плюралізмам, грамадства пакуль што не авалодала разнастайнасцю каштоўнаснага зместу жыцця ў такой ступені, каб даць яму магчымасць умацавацца, развіўшы дэмакратычныя структуры, юрыдычныя нормы і правілы. Яно дало прастор публічнасці, наяўнасці ў жыцці каштоўнасных інавацый, якія часам прыводзяць да сутыкнення гэтых каштоўнасцей. Аднак сутыкненне ўласцівае не толькі нашаму грамадству. У заходняй навуцы назапашаны велізарны вопыт пераходу ад гістарычна пройдзенага шляху грамадства да сучаснага. Даследаваны агульныя заканамернасці развіцця, а таксама розныя праблемы, звязаныя з сацыякультурнымі асаблівасцямі, што ўзнікаюць на шляху мадэрнізацыі [5].

На жаль, беларуская навука да апошніх гадоў не звярталася да канцэпцый мадэрнізацыі. Само слова “мадэрнізацыя” ў дачыненні да сацыякультурных працэсаў было забаронена ў той час, як грамадства знаходзілася ў сітуацыі экстэнсіўнай, часта не прадуманай эксплуатацыі прыродных, культурных, чалавечых рэсурсаў.

На сучасным этапе развіцця нашага грамадства неабходна асэнсаваць спецыфіку ажыццяўляемых рэформаў і працэс мадэрнізацыі. Безумоўна, што само па сабе перапляценне традыцыйных і мадэрнізаваных элементаў у адным і тым жа грамадстве не абавязкова набывае негатыўны сэнс. Магчыма ў дастатковай ступені мірнае суіснаванне старога і новага. Аднак частковая мадэрнізацыя і не даведзенае да лагічнага завяршэння рэфарміраванне грамад- ства могуць прывесці да анамальнага працякання сацыяльных працэсаў. Узнікае небяспека магчымых ненатуральных “склеек” традыцыйнага і сучаснага пачаткаў.

Палітычныя, эканамічныя, сацыякультурныя асаблівасці Беларусі вызначаюць неабходнасць стварэння ўласных арыгінальных канцэптуальных распрацовак і праграм, якія павінны даць магчымасць прымяніць навуковыя і практычныя веды для вырашэння задач па рэфарміраванні нашай дзяржавы, выпрацоўцы эфектыўнай культурнай нацыянальнай палітыкі і выкарыстанні яе як неабходнага рэсурсу для эфектыўнага грамадскага развіцця.

Чалавек заўсёды знаходзіцца паміж імкненнем захаваць атрыманую ў спадчыну культуру і патрэбнасцю ўзбагаціць яе, змяніць, пераасэнсаваць, рэарганізаваць раней створанае. Чалавек, сацыяльная група, грамадства павінны вырашаць праблему каштоўнасцей як пераадоленне процілегласці полюсаў, ацэньваць і пераглядаць ацэнку элементаў сваёй жыццядзейнасці. Напрыклад, развітому дынамічнаму прадпрыемству, сучаснай установе культуры, якая эфектыўна працуе, проста неабходна ўдасканальваць сваю арганізацыю ў адпаведнасці з новымі мэтамі, сродкамі, магчымасцямі. Інакш кажучы, вытворчасць, усе яе параметры ёсць вынік рэпрадуктавання і адначасова здольнасць чалавека пастаянна сябе аднаўляць насуперак розным знешнім і ўнутраным фактарам, забяспечваць сваё існаванне і развіццё.

Мадэрнізацыя грамадства непазбежна звязана з глыбокімі зрухамі не толькі ў змесце каштоўнасцей, але і ў самім механізме іх змен. Гэты працэс нельга зразумець у адрыве ад культуры і навукі, якая яго вывучае і даследуе. Культура ўсведамляецца не толькі як сканцэнтраваны вопыт усёй папярэдняй гісторыі, як увасабленне прыгожага, карыснага, мудрага, але і як асаблівая рэальнасць [6]. Культуры ўласцівая пэўная загадкавасць, яна заўсёды звернута да раней невядомага. Пры гэтым важна пераадолець страх перад інавацыямі, які даволі часта ўзнікае па прычыне няздольнасці вызначыць сэнс гэтых інавацый, няўмення накіраваць іх на ўмацаванне і развіццё ўжо сфарміраваных каштоўнасцей, вопыту, інтуіцыі, сэнсу. Таму інавацыі часцей за ўсё з-за абачлівасці і асцярожнасці адхіляюцца як разбуральныя, негатыўныя. Такім чынам, існуючая супярэчнасць “традыцыйныя падыходы – новыя тэхналогіі” выяўляецца ў “механізме тармажэння” сацыякультурнага развіцця грамадства, у спробах знайсці адказы на пытанні: якімі павінны быць сацыяльныя адносіны? Што варта змяніць? Якія адносіны ўяўляюцца пазітыўнымі, а якія маюць негатыўнае адценне?

Нацыянальная культура практычна заўсёды ў той або іншай форме мае адказы на гэтыя пытанні. Але ў розных культурах адказы могуць быць розныя, нават супрацьлеглыя. Напрыклад, адносіны, што склаліся, непарушныя, і нават думка пра тое, каб іх змяніць, падаецца немагчымай; або: адносіны, што склаліся, мала эфектыўныя, і трэба шукаць шляхі іх удасканалення. Аднак адказы, паколькі яны абапіраюцца на ранейшы вопыт, амаль заўсёды абстрактныя, недастатковыя ў святле новых умоў, наяўнасці сродкаў, зменлівых па- трэбнасцей і інш. Такім чынам, хоць культура заўсёды дае нейкі адказ на па- стаўленае пытанне, гэты адказ застаецца як не да канца сфармуляваная і тым больш не да канца вырашаная праблема.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значыць, супярэчнасць “традыцыйныя падыходы – новыя тэхналогіі” ўзнікае штодня і, у сваю чаргу, стымулюе чалавека, дае імпульс творчасці, пошуку культурных і сацыяльных інавацый. Атрымліваецца, што такая супярэчнасць як быццам не толькі не мае небяспекі для грамадства, але з’яўляецца яго неабходным элементам, рухальнай сілай. Усё гэта так, але пры адной умове: калі суб’ект аказваецца здольным пераадольваць, здымаць гэту супярэчнасць, зводзіць яе да мінімуму.

Мадэрнізацыя неаддзельная ад культурных пераўтварэнняў, у прыватнасці ад пераўтварэнняў у каштоўнасных арыентацыях. Гістарычная практыка сведчыць пра тое, што шлях еўрапейскіх краін, звязаны з індустрыялізацыяй, з’яўляецца пэўным арыенцірам для многіх краін свету і з улікам сацыякультурных змен стаў звычайнай неабходнасцю. Разам з тым з пункту гледжання жыццёвай логікі мадэрнізацыя не з’яўляецца абавязковым, непазбежным працэсам. Аднак тыя эканамічныя і палітычныя перавагі, якія атрымалі краіны, што сталі на гэты шлях, заахвоцілі і іншыя дзяржавы да падобных змен. Аналагічны працэс набірае сілу і ў Беларусі. Усё часцей Прэзідэнт і Урад ставяць задачы па распрацоўцы канкрэтных праграм, звязаных з павышэннем эфектыўнасці эканомікі, навукі, культуры краіны. Гэта і ёсць пошук мадэляў мадэрнізацыі дзяржавы. Імкненне не толькі да дабрабыту, але перш за ўсё да вызначэння свайго месца на сусветнай арэне становіцца крыніцай мадэрнізацыйных імпульсаў. Дамінуючыя тэндэнцыі такога кшталту істотныя і таму, што маюць на мэце сацыякультурныя змены, разбурэнне стэрэатыпаў, што склаліся і з’яўляюцца тормазам у развіцці грамадства. Пры гэтым гаворка вядзецца не пра тое, каб наўпрост перанесці на нашу глебу ўжо гатовыя, распрацаваныя ў іншых краінах канцэпцыі мадэрнізацыі. Такое здараецца, але рэдка і звычайна беспаспяхова з-за розніцы ў стартавых умовах, традыцыях, асаблівасцях развіцця грамадства, што гістарычна склаліся, і інш. Сёння спецыялісты ў галіне эканомікі ўсе часцей гавораць аб “беларускай мадэлі развіцця”, аб стварэнні сацыяльна арыентаванай эканомікі з адэкватнай інфраструктурай, дзейснымі механізмамі дзяржаўнага і рынкавага рэгулявання, якія забяспечваюць успрымальнасць да навукова-тэхнічнага прагрэсу. Гэта работа павінна быць прадуманай і настойлівай, бо на рэфарміраванне грамадства, разгортванне мадэрнізацыйных працэсаў заўсёды ўплываюць недахоп унутраных імпульсаў, масавае імкненне перайсці на рэйкі больш складаных тэхналогій, формы працы інш. У сувязі з гэтым патрэбнасць у мадэрнізацыі перарастае ў канчатковым выніку ў патрэбнасць рэформаў, якія могуць выступаць у розных формах, закранаць розныя сферы жыцця, у тым ліку і развіццё сацыякультурнага працэсу [7].

Як вядома, грамадства неаднароднае ў культурных адносінах і распадаецца на сацыякультурныя групы, якія адрозніваюцца ўзростам, нацыянальнасцю, прафесійным статусам і да т. п. Кожная з такіх груп патрабуе выпрацоўкі спецыяльнай, адрасаванай ёй стратэгіі, якая ўлічвае асаблівасці, значэнне ў грамадстве і перспектывы. Напрыклад, старэйшая ўзроставая група насельніцтва краіны пачынаючы з 55 гадоў з пункту гледжання ўспрымання каштоўнасцей мадэрнізацыі хутчэй за ўсё мала перспектыўная. У асноўным яе прадстаўнікі завяршылі працоўны цыкл. У адносінах да гэтай групы гаворка можа весціся аб прымірэнні з рэальнасцю. На другім полюсе культурнай арыентацыі знаходзіцца моладзь (пасля школы і да трыццаці гадоў) – частка грамадства найбольш псіхалагічна падрыхтаваная да ўспрымання новага ладу жыцця і яго каштоўнасцей. Нарэшце, яшчэ адна ўзроставая група (30–45 гадоў) – асноўная частка грамадства, яна з’яўляецца касцяком пераўтварэнняў.

Адносіны да мадэрнізацыі таксама звязаны і з прафесійнай арыентацыяй. Так, тэхнічная інтэлігенцыя ў псіхалагічным плане з’яўляецца даволі складанай групай. Унутры яе адбываецца расслаенне, узнікаюць супярэчнасці, якія часта залежаць ад сацыяльных перспектыў канкрэтнага чалавека, яго бліжэйшага акружэння, новай эканамічнай рэальнасці. У цэлым тэхнічная інтэлігенцыя дэманструе бóльшую падрыхтаванасць да жыцця па-новаму, чым гэта было яшчэ ўчора.

Значна больш складанае становішча з гуманітарнай інтэлігенцыяй. Гэта звязана з тым, што яна з'яўляецца носьбітам традыцыйных інтэлігенцкіх рэфлексаў, а таксама з тым, што сацыяльныя перспектывы ў значнай частцы гэтай групы сёння мінімальныя. Цяпер назіраецца своеасаблівы працэс размежавання 30-гадовых інтэлектуалаў, публіцыстаў, літаратараў з шасцідзесятнікамі, сямідзесятнікамі.

У асяроддзі рабочых адбываецца працэс расслаення, шмат у чым аналагічны таму, што праходзіць у асяроддзі тэхнічнай інтэлігенцыі (прыблізна ў суадносінах 50/50). Неаднародная катэгорыя грамадства – работнікі кіруючага апарату ("апаратчыкі"): адна частка яе, звязаная з ценявой эканомікай, упісалася ў новыя рэаліі; другая, значная частка па сваіх асабістых якасцях,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыі, падрыхтоўцы асуджана на маргіналізацыю; нарэшце, пэўная частка разумее бег часу і яго патрабаванні. Сярод розных узроставых і адукацыйных груп грамадства выдзелім тыя, што перш за ўсё цікавыя з пункту гледжання ўкаранення інавацый і будучай мадэрнізацыі грамадства. Моладзь – самая вялікая, найбольш здольная да ўспрымання мадэрнізацыйных працэсаў група. Шмат якія прыметы сведчаць пра тое, што моладзь падрыхтавана да таго, каб зрабіць жыццёвы выбар на карысць новых рэформаў і мадэрнізацыі. Напры- клад, маладыя людзі прагматычныя, арыентаваныя на асабістыя праблемы і пры гэтым слаба палітызаваныя. Моладзь вылучае сябе з навакольнага асяроддзя спецыфічнай культурай, таму маладзёжны стыль трэба выкарыстоўваюць як мага шырэй у спецыяльных праграмах устаноў культуры і мастацтва, прэсе. Размову з моладдзю трэба весці так, каб арыентаваць яе на пазітыўныя каштоўнасці. У нашай краіне ёсць таленавітыя дзеячы навукі, культуры і мастацтва, ідэолагі, журналісты, нават інфраструктуры, здольныя ажыццяўляць гэту складаную работу на належным ідэалагічным узроўні. На сённяшні дзень ёсць унікальныя магчымасці з выкарыстаннем розных мастацкіх, выяўленчых, сучасных тэхнічных сродкаў стварыць галерэю прывабных вобразаў лідэраў бізнесу, палітыкаў, дзеячаў навукі і культуры. На наш погляд, вакол гэтага і павінна быць засяроджана стратэгія работы з маладзёжнай аўдыторыяй.

Дзеці – велізарная група грамадства, вельмі важная і вызначальная ў стратэгічным плане. Мы перакананы, што патэнцыяльныя магчымасці ў рабоце з дзецьмі выкарыстоўваюцца далёка не поўнасцю і не зусім прадумана, хоць менавіта на іх дзяржава павінна канцэнтраваць асаблівую ўвагу. Усё, што яшчэ памятнае і актуальнае для нас, для іх – гісторыя. Яны апынуліся на тым этапе развіцця грамадства, калі адсутнічаюць пазітыўныя мадэлі, ідэалы, прыклады, якія вызначаюць асноватворныя адносіны да свету. І цяпер даволі часта дзеці ўзбагачаюць сябе гэтымі неабходнымі кожнаму чалавеку ведамі, пачэрпнутымі з замежнай культуры.

Культуролагі, сацыяльныя псіхолагі адзначаюць, што базавыя каштоўнасці грамадства фарміруюцца ў казках, дзіцячых вершах, гісторыях для дзяцей. Тут у сціслым выглядзе пададзены міфы, нормы і каштоўнасці, жыццёвыя арыенціры, г. зн. усё тое, што пазней разгортваецца ў свядомасці дарослага чалавека. Наша сучасная культура адчувае на сабе ўздзеянне непажаданых працэсаў, калі персанажы перакладных твораў – Карлсаны, Мумі-Тролі, Мэры Попінсы і іншыя – выцясняюць Ямеляў, Іванушкаў, Пакаці-Гарошкаў, Катоў-Баюноў, Удовіных сыноў і інш. Такім чынам, паступова змяняецца базавы ідэал культуры, які фарміруецца і замацоўваецца на ўзроўні дзіцячых казак. Сёння дзеці часта шукаюць духоўныя скарбы ў відэапатоку. Між іншым відэакультура ўтрымлівае не толькі пазітыўныя, але і негатыўныя тэндэнцыі. Баевікі, гангстэрскія фільмы, прасякнутыя сумніўнай мараллю, нясуць у сабе агрэсіўны напал культу сілы.

Неабходна велізарная работа па стварэнні папулярнай літаратуры для дзяцей і падлеткаў, якая раскрывала б гісторыю чалавецтва, дакладную гісторыю станаўлення і развіцця нашай дзяржавы, спрыяла б выхаванню ў дзяцей гістарычнага мыслення, усталёўвала сапраўдныя каштоўнасці, якія б супрацьстаялі хаосу, жорсткасці, культу крымінальнага і палітычнага гвалтавання. Прапаганда сапраўдных каштоўнасцей павінна сцвярджаць станоўчы ідэал сацыяльнай адказнасці, які мае на мэце высокаэфектыўную працу, строгую дзелавую этыку, ініцыятыву, прадпрымальнасць, адданасць пастаўленай мэце. Такой літаратуры, адрасаванай не толькі нашым дзецям, але і моладзі наогул, амаль зусім няма. Патрэбны конкурсы, прэстыжныя прэміі аўтарам, паслядоўная выдавецкая палітыка. У змест школьнага навучання варта ўвесці грунтоўны курс прававых ведаў. Неабходна ствараць культурную шматмерную і матывацыйную прастору, у якой будзе фарміравацца маладое пакаленне.

Нашай палітычнай эліце давядзецца асэнсаваць і сфармуляваць найбольш прыярытэтныя сацыяльныя запатрабаванні, якім павінна адпавядаць эфектыўная інфармацыйная дзейнасць па забеспячэнні мадэрнізацыйнага развіцця краіны. Рана ці позна Беларусь вымушана будзе вырашаць праблему пераходу ад тэхнакратычнай парадыгмы развіцця да, умоўна кажучы, гуманістычнай парадыгмы, паслядоўна і цярпліва ствараючы праграму суцэльнай мадэрнізацыі Беларусі, вызначаючы шляхі яе ўваходжання ў сучасны свет. Неабходна вызначыць шляхі і сродкі забеспячэння пераходу ад мабілізацыйнага да інавацыйнага тыпу развіцця краіны.

З аналізу тых супярэчлівых працэсаў, якія адбываюцца ў розных краінах у ходзе мадэрнізацыі, а таксама ў Беларусі, варта зрабіць некаторыя агульныя вывады.

Працэс мадэрнізацыі не можа разглядацца як рэалізацыя нейкай “узорнай мадэлі”, сфарміраванай на вопыце шэрага заходніх краін. Гэты працэс у любой краіне непазбежна сутыкаецца з некаторымі супярэчнасцямі, якія накладваюцца на рэальную сацыяльна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эканамічную, палітычную і сацыякультурную спецыфіку пэўнага грамадства. Праз вызначэнне такога роду супярэчнасцей у сацыякультурным плане мы можам сістэмна ўявіць агульны характар працэсаў, што адбываюцца ў грамадстве.

Першай, найбольш відавочнай супярэчнасцю працэсу мадэрнізацыі ў сферы культуры з'яўляецца супярэчнасць паміж неабходнасцю дастаткова хуткага абнаўлення наяўнага культурнага набытку і сістэмы духоўнай рэгуляцыі, якая ўжо не адпавядае новым патрэбнасцям грамадства, і захаваннем таго каштоўнага, што падтрымлівае жыццёва важныя функцыі грамадства ў яго разнастайнай і шматузроўневай сістэме вытворчасці і дзейнасці. Гэта супярэчнасць часам выліваецца ў процістаянне між прыхільнікамі мадэрнізацыі і кансерватарамі, прыхільнікамі заходніх мадэляў і нацыянальнай самабытнасці, між прыхільнікамі новай індустрыі культуры, яе пераводу на рынкавыя адносіны і тымі, хто абараняе гуманістычныя набыткі культуры мінулых гадоў. Варта падкрэсліць, што ўсталяванне утылітарных арыентацый, ухваленне багацця і спажывання могуць запоўніць толькі абмежаванае месца ў культурным комплексе грамадства, за межамі якога па-ранейшаму неабходныя ідэйна ўзвышаныя, высокадухоўныя арыентацыі, устойлівыя ідэалы і ўяўленні пра належнае і дастойнае.

Другая сутнасная супярэчнасць працэсаў мадэрнізацыі грамадства – гэта сутыкненне паміж патрэбнасцю ў радыкальным абнаўленні і пераадоленні ўсталяваных у грамадстве застойных парадкаў, што прывялі да нарастаючага адставання грамадства ад сучаснага сусветнага ўзроўню, з аднаго боку, і неабходнасцю падтрымання сацыяльнай стабільнасці і адзінства грамадства – з другога. Як у гаспадарчым, так і ў сацыякультурным плане абнаўленне азначае перш за ўсё шырокае ўкараненне рынкавых адносін і прыватнай уласнасці. Адначасова падпадае пад радыкальнае змяненне сістэма сацыялізацыі грамадства ў цэлым. Такія змены непазбежна цягнуць за сабой падрыў усталяваных маральных нормаў і каштоўнасцей, што выяўляецца ў росце карыслівых, карумпіраваных, крымінальных адносін, расслаенні грамадства на багатых і бедных. Гэта адначасова эканамічная, маральная і сацыякультурная праблема, бо вынікам расслаення становіцца не толькі колькасная дыспрапорцыя, але і спадчынны характар масавай беднасці на фоне ўсё ўзрастаючага дабрабыту і багацця нешматлікай часткі грамадства. У значнай часткі насельніцтва ўзнікаюць стан анаміі і пачуццё адчужанасці ад грамадства, што звужае размах ініцыятывы ў грамадстве і падрывае яго чалавечы патэнцыял.

Трэцяя супярэчнасць – між неабходнасцю шырокага запазычання сучаснага сусветнага вопыту і захаваннем самабытнасці грамадства, без якога яно перастае быць самастойным суб'ектам сусветных адносін. Шырокая адкрытасць грамадства палягчае засваенне найноўшых дасягненняў знешняга свету, перш за ўсё высокаразвітых краін. Аднак адваротным бокам такой адкрытасці робіцца празмернае імітатарства, перайманне, залішні перанос элементаў чужародных культур, што прыводзіць да падрыву ўласнага культурнага набытку. Сляпое капіраванне ўзораў іншаземнай культуры без належнай адаптацыі да свайго набытку абарочваецца не толькі духоўным, але і сацыяльным разладам, які спараджае рэакцыю адарвання.

Фарсіраваная вестэрнізацыя ўсталёўвае спажывецкія каштоўнасці, забяспечвае маніпулятарнае адцягненне ад змястоўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці; асновай жыцця робіцца культ забаў.

Заклік да "ўваходжання ў сусветную цывілізацыю", які часта сустракаецца ў публіцыстыцы, мае на ўвазе наяўнасць толькі адной цывілізацыі – еўрапейска-амерыканскай. Між тым, нягледзячы на актыўнае пранікненне заходняй культуры, у сусветных культурных працэсах захоўваюцца ўстойлівыя структуры іншых сусветных цывілізацый. Беларусь мае свае цывілізацыйныя характарыстыкі, багатыя культурныя традыцыі і не можа дапусціць адрыву ад сваёй культурнай спадчыны.

З гэтай прычыны ўсякі паўнацэнны, сапраўды навуковы разгляд сучасных або існаваўшых раней праблем грамадства, а таксама выяўленне перспектыў яго змянення, укараненне мадэрнізацыйных працэсаў патрабуюць уліку розных бакоў, вымярэнняў, узроўняў і кампанентаў. Адпаведна і ўсякая практычная работа па мадэрнізацыі сацыякультурных працэсаў павінна адбывацца на аснове ўзаемадзеяння розных інстытутаў і з улікам тых разнастайных кампанентаў (дзяржаўных, гаспадарчых, сацыяльных, кіруючых камерцыйных, адукацыйных, навуковых і інш.), якія і складаюць культурную сістэму [8]. Разам з тым культура ў значнай ступені ствараецца ў духоўнай прасторы асобы і міжасобасных адносін. Менавіта ўзаемадзеянне ўсіх гэтых кампанентаў і забяспечвае паступовае, але паўнацэннае і ўстойлівае вырашэнне складаных праблем культурнай трансфармацыі і паспяховай мадэрнізацыі грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Можейко М.А.* Модернизации концепция // Новейший философский словарь. — 2-е изд., перераб. и доп. / Редсовет: А.А.Грицанов (председатель) и др. — Мн.: Интерпресс-сервис; Книжный дом, 2001. — С. — 639–642.

2. *Ахиезер А.С.* Ценности, культура и социальные отношения // Модернизация в России и конфликт ценностей / [А.С.Ахиезер, Н.Н.Козлова, С.Я.Матвеев и др.; РАН. Ин-т философии]. — М., 1994. С. 14.

3. *Дэталёва* апісаны гэтыя працэсы ў кн.: Развивающиеся страны: экономический рост и социальный прогресс / Под ред. В.Л.Шейниса, А.Я.Эльянова. — М.: Наука, 1983. – Главы XII—XIII).

4. *Ерасов Б.С.* Социальная культурология. — М., 2000. — С. 461.

5. *Козловский В.В., Уткин А.И., Федотова В.Г.* Модернизация: от равенства к свободе. — СПб., 1995. — С. 89.

6. *Ахиезер А.С.* Конфликт ценностей — социальная проблема // Модернизация в России и конфликт ценностей / Отв. ред. С.Я. Матвеева. — М., 1994. — С. 69.

7. *Глушаков В.Е.* Вызов времени: Беларусь на пороге тысячелетий. — Мн.: ЗАО «Белбизнес-Пресс», 1999. — С. 102–103.

8. *Яковенко И.Г.* Предпринимательские ценности в маргинальной среде. — М., 1994. — С. 319.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ